# 2023 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

Звесткі з архіва
Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з'яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2023 год з'яўляецца юбілейным.*

**Барадулін, Р. Нагбом: Лірыка / Рыгор Барадулін. – Мінск: Беларусь, 1963. – 139 с.**

# 60 гадоў




«Нагбом» – гэта трэцяя кніга народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна (1935–2014). У назву вынесена слова, якое ўжываецца ў выразе «піць нагбом», што азначае ‘піць з вялікай пасудзіны, нахіліўшы яе’.

У набор кніга была здадзена 28.06.1963, а падпісана да друку 25.09.1963. Рэдактарам стаў Валькарэм Нікіфаровіч.

Выданне мела цвёрды пераплёт і супервокладку.

Тыраж – 3000 экзэмпляраў.

# «Нагбом»: 60 гадоў





Рыгор Барадулін нарадзіўся 24 лютага 1935 года ў вёсцы Гарадок, Ушацкага раёна, Віцебскай вобласці. У 1954 годзе паступіў у Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна. Скончыў філалагічны факультэт універсітэта ў 1959 годзе.

Нізка вершаў «На зямлі цалiннай» Рыгора Барадуліна была адзначана сярэбраным медалем VI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве ў 1957 годзе.

Першы зборнік вершаў «Маладзік над стэпам» выйшаў у 1959 годзе. У 1961 годзе ў Мінску выходзіць кніжка вершаў Рыгора Барадуліна «Рунець, красаваць, наліваццa», а ў Маскве — зборнік «Цаліна-град».

Героі паэта — нашы маладыя сучаснікі, будаўнікі Нафтаграда ля Полацка і Салігорскага калійнага камбіната, рабочыя, студэнты, калгасная моладзь. Ім прысвячае Рыгор Барадулін і свае новыя вершы, сабраныя ў кніжцы «Нагбом».













Мастацкі рэдактар кнігі «Нагбом» – Леанід Прагін, а непасрэднае мастацкае афармленне выканана Барысам Заборавым.

Вершы ў зборніку пададзены чатырма часткамі: «Кастрычнік» (17 твораў), «Прадчуванне» (21 твор, у тым ліку і аднайменны верш «Нагбом»), «Сады» (24 творы) і «Трыпціх» (4 творы).

# «Нагбом»: 60 гадоў

У частцы «Кастрычнік» зборніка «Нагбом» змешчаны вершы, аб'яднаныя тэмай любові да роднай Беларусі і павагі да яе працавітага і таленавітага народа.

Частка «Прадчуванне» з заглаўным вершам «Нагбом» дапаўняе папярэднюю такімі тэмамі, як незнішчальнасць і сіла беларускага народа, яго духоўная веліч, пераемнасць пакаленняў і значнасць помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры для нашчадкаў.

У творах часткі «Сады» разнастайныя тэмы дыфузна спалучаюцца з тэмамі роднай прыроды і экалогіі.

Частку «Трыпціх» можна вызначыць як даніну памяці Рыгора Барадуліна самым дарагім людзям – бацьку Івану Рыгоравічу, які ваяваў у партызанскім атрадзе і загінуў падчас карнай нямецкай аперацыі супраць партызанаў, і маці Акуліне Андрэеўне, якая адна несла на сваіх плячах нястачу і цяжар вайны, гадавала сына і якая ўдыхнула ў душу будучага паэта любоў і чуйнасць да роднага слова.

# «Нагбом»: 60 гадоў

Заглаўны верш зборніка «Нагбом» – гэта своеасаблівы ўспамін Рыгора Барадуліна аб страшных гадах Вялікай Айчыннай вайны. Паэт вельмі добра захаваў у памяці момант са свайго дзяцінства: ідзе «трэцяя партызанская вясна», партызанская зона, малады партызан-сувязны п’е нагбом з вядра ваду каля старога калодзежа:

*Паветра ўдыхнуўшы,*
*хлопец дзьме*
*на ільдзінкі –*
*б’юцца ў клёпкі са звонам,*
*яшчэ адзін уздых ягоны –*
*сонца, як перагрэтая*
*медзь,*
*у сценку драўляную*
*стукае мякка.*
*Нагбом*
*з поўнага*
*п’е партызан са*
*смакам –*
*толькі ходзіць кадык.*

… Потым стрэл – і нямецкая куля спыняе маладое жыццё... У вершы прысутнічаюць дзве ключавыя постаці, два героі. Першы – малады і жыццярадасны сувязны, які толькі пачаў рабіць першыя крокі ў дарослым жыцці. Другі – лірычны герой, праз успрыняцце якога чытач бачыць падзеі і разам з якім «пражывае» ўсю вастрыню эмоцый ад несправядлівай страты…

# «Нагбом»: 60 гадоў

Прачытаць творы Рыгора Барадуліна са зборніка «Нагбом» можна на сайце http://maxima-library.org/mob/b/409350?format=read.

Цікавая інфармацыя пра жыццё і творчасць Рыгора Барадуліна падаецца ў дакументальным фільме **«Святло далёкай зоркі. Рыгор Барадулін»,** размешчаным на канале YouTube па адрасе: https://www.youtube.com/watch?v=xXXaSXWLpsc&t=254s.

Звярнуўшыся да відэа **«Сустрэчы ў БДУ. Рыгор Барадулін 16.10.2003»**, размешчанага на тым жа рэсурсе па адрасе https://www.youtube.com/watch?v=eKuebzVvxzc, можна ўбачыць і самага паэта і пачуць яг голас.